Аддзел адукацыі, спорту і турызму Кармянскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія г.п. Карма”

Рэспубліканскі конкурс навуковых краязнаўчых работ
**Намінацыя: культурная спадчына**

Навучальна-даследчая праца

# «**Не згасне жывое народнае слова!**»
(каляндар народных свят і звычаяў)

Падрыхтавалі
вучаніцы VIII “А” класа
ДУА “Гімназія г.п. Карма”,
Падаляцкая Вікторыя Дмітрыеўна
і Елагіна Юлія Аляксандраўна

Кіраўнік
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Гімназія г.п.Карма”,
Чакалава Святлана Васільеўна
+375(44)7020789
г.п.Карма
вул. Паркавая,1

Карма 2023

Змест

1. Уводзіны……………………………………………………………3
2. Народны каляндар свят і звычаяў……………………………....4
2.1. "Восень – пагод восем…" ……………………………………4
2.2. "Зіма як казка сваё возьме" …………………………….....7
2.3. "Вясна-красна, што ты нам прынясла?"……..........................10
2.4. "А лецейка-лета, добрая пара…"……………………………12
3. Заключэнне…………………………………………………………16
4. Спіс выкарыстаных крыніц………………………………………...17
Дадатак

# Уводзіны

У Год гістарычнай памяці найбольш павысілася цікавасць да той мясціны, дзе чалавек нарадзіўся. І як падкрэсліў Прэзідэнт: “Настаў час кожнаму не толькі ўспомніць аб сваіх каранях, аб месцы, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалачку зямлі. Настаў момант праявіць сябе і ўпісаць сваё імя ў гісторыю гэтай малой радзімы, гэтага кавалачка нашай зямлі".

У нашым грамадстве ўзрасла цікавасць да народных традыцый і культурных каштоўнасцей мінулага, бо фарміраванню светапогляду маладога пакалення садзейнічае яго далучэнне да культуры свайго народа. Традыцыйныя святы на Беларусі – адметная фальклорная з'ява, таму асноўнай мэтай навучальных і культурных устаноў павінна стаць іх аднаўленне, падтрымка, папулярызацыя. Калі хочаш пераканацца, што Гомельшчына – унікальны палескі край, населены спевакамі, казачнікамі, знаўцамі таямніц магічнага слова, людзьмі, творча адоранымі ад прыроды, наведай Кармянскі раён. На тэрыторыі Кармянскага раёна даволі поўна прадстаўлены амаль усе фальклорныя жанры. Трывала захоўвае народная памяць традыцыйны абрадавы фальклор, хоць многія абрады і звычаі ў значнай ступені трансфарміраваліся, страцілі ранейшыя магічныя функцыі, захаваўшы толькі пацешлівы, святочна-карнавальны характар.

***Актуальнасць работы*:** 2022 год быў аб’яўлены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Годам гістарычнай памяці з мэтай фарміравання аб'ектыўнага стаўлення грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа. Сапраўды, беларускі народ знаходзіцца ў наш час на крытычным пераломе ў сваім гістарычным існаванні – сцвярджае і адраджае старажытнасць, непаўторнасць і самабытнасць сваёй нацыянальнай культуры. Зробіць ён свой уклад у скарбонку сусветнай культуры і тым самым сапраўды зойме “свой пачэсны пасад між народамі” ці не – залежыць у найбольшай ступені ад ахвярнай працы на святой ніве адукацыі і культуры. Я лічу, што на сённяшні дзень гэта тэма застаецца яшчэ актуальнай, таму што кожны

адукаваны чалавек павінен ведаць свае карані, гісторыю сваёй малой радзімы, а таксама перадаць свае веды будучым пакаленням.

***Мэта:*** вывучэнне традыцыйнай народнай культуры ў цэлым, духоўнай культуры сваёй мясцовасці.

***Задачы:***

1. Пазнаёміцца з літаратурай па дадзенай тэме.
2. Сабраць матэрыял для знаёмства з каляндарнымі святамі, традыцыямі і звычаямі нашага народа.
3. Праз дзейнасць вучняў студыі “Спадчына” папулярызаваць народнае мастацтва ў школьным асяродку.
4. Стварыць міні-часопіс традыцый і звычаяў мінулага роднага краю.

Перад тым, як узнікла задума стварыць міні-часопіс традыцый і звычаяў нашага народа, хацелася даведацца, ці ведаюць вучні гімназіі і жыхары пасёлка тыя каляндарныя святы і звычаі, якія мы ім прапанавалі ў анкеце. У выніку апытвання вучняў гімназіі і іх бацькоў атрымалася, што некаторыя святы, абрады і звычаі забываюцца, іх ведаюць не ўсе вучні, а таксама іх бацькі.

На пытанне: “Якія восеньскія, зімовыя, веснавыя, летнія святы (з народнага календара) вы ведаеце?” Адказы былі розныя, іх вынікі прадстаўлены ў табліцы (дадатак №10, табліца 1).

На пытанне:“Традыцыі і звычаі якіх восеньскіх,зімовых,веснавых, летніх свят (з народнага календара) захоўваюцца ў вашай сям'і(у вашай мясцовасці)?” Вынікі адказаў прадстаўлены (дадатак №10,табліца 2).

А вось на пытанне: “Ці патрэбна захоўваць традыцыі і звычаі каляндарных свят, якія існуюць у вашай с'ямі (мясцовасці)?” адказы былі наступныя: так – 100%, не – 0%.

“Ці будзеце вы прадаўжальнікамі традыцый і звычаяў сваёй сям'і (сваёй мясцовасці) ў будучым?”: так – 88%, не – 12%. У выніку мы пераканаліся, што трэба як мага больш даведацца аб мінулым нашага народа, чым жылі нашы продкі і чым займаліся, што іх хвалявала і аб чым яны марылі, а таксама

ўзнаўляць тыя абрады, звычаі, якія яшчэ жывуць у памяці людзей старэйшага пакалення.

**2.1“Восень – пагод восем…”**

Найбольш значныя вераснёўскія святы – **Другая Прачыстая** (Раство Маці Божай), якая адзначалася 21 верасня, і Уздзвіжанне – 27 верасня. На працягу верасня звычайна ўпраўляліся з найбольш працаёмкімі работамі. Вечары былі ўжо доўгія, з'яўлялася больш вольнага часу. І звычайна ад Другой Прачыстай, па - рознаму, у залежнасці ад мясцовых традыцый, пачыналася пара вячорак. У недалёкім мінулым **вячоркі** мелі вельмі вялікае і важнае значэнне ў жыцці ўсёй вёскі, яны былі важным элементам звычаёвай традыцыі. На вячорках у моладзі з'яўлялася магчымасць прыгледзецца адзін да аднаго, бліжэй пазнаёміцца, строіць пэўныя планы на шлюб. На вячорках звычайна пралі кудзелю (дадатак№1, малюнак 1). Гэта быў занятак дзяўчат. Прысутнічалі і хлопцы, якія, як правіла, бавілі час без пэўнага працоўнага клопату і адно толькі перашкаджалі дзяўчатам працы.

**Уздзвіжанне** падводзіць у асноўным мяжу многім восеньскім турботам. І тады, калі ўжо выбралі бульбу, калі асыпалася лісце, калі ўранні быў мароз, з'яўляўся яшчэ адзін вельмі хвалюючы для кожнага вяскоўца працоўны клопат, які тым не менш даваў спачын спрацаваным рукам, прыбаўляў душэўнага здароўя. На Узвіжанне не хадзілі ў лес. Лічылася, што ў гэты дзень паўзуны (змеі, гадзюкі) хаваюцца ў норы.

Асобна ў восеньскай абраднасці вылучаюцца тэмы талакі і так званага піва. **Талака** – глыбока чалавечны і высакародны звычай аказання дапамогі вяскоўцам, якія па розных прычынах не маглі ўправіцца сваімі сіламі, уласнымі намаганнямі (дадатак№1, малюнак2). Асабліва часта да талочнай узаемадапамогі звярталіся пасля вайны, што, зразумела, было выклікана недахопам дужых мужчынскіх рук. Як правіла, талокі збіраліся для аказання дапамогі ў будаўніцтве хаты або іншых гаспадарчых пабудоў, у гарачую пару жніва і калі выбіралі бульбу. Як можна меркаваць, талочныя звычаі ў недалёкім

мінулым былі шырока распаўсюджанымі, а дзе – нідзе яны захаваліся і да сённяшняга дня як сведчанне вясковага, абшчыннага ладу жыцця.

Асноўнае кастрычніцкае свята – **Пакровы** (Пакравы), якое адзначаецца 14 кастрычніка (дадатак №1, малюнак 3). Гэтае свята клала пачатак восеньскаму перыяду вяселляў. На Пакровы дзяўчаты, якія жадалі выйсці замуж, у царкве палілі свечку з малітвай аб хуткім замужжы. Яшчэ з Пакровамі звязвалася варажба дзяўчат наконт свайго будучага лёсу. На Пакровы ладзіліся кірмашы. Так, у нашай мясцовасці кірмаш вядомы на ўсё наваколле. Тут прадаюць здабытак сваіх рук, сваёй працы: агародніну, садавіну, швейныя вырабы, гаспадарчыя рэчы і інш. А раней на такіх кірмашах не толькі набывалі неабходнае, але і прыязджалі з мэтай паказаць сваіх дзяцей шлюбнага ўзросту, пашукаць для іх жаніха ці нявесту. Моладзь, такім чынам, была паўнаўладным удзельнікам кірмашу. Многія знаёміліся на кірмашах, знаходзілі свой лёс.

У лістападзе найбольш значныя каляндарныя даты – гэта восеньскія Дзяды (дадатак №1, малюнак 3) і пачатак Піліпаўскага посту. Восеньскія **Дзяды** –рухомая дата ў народным календары. Лёгка і беспамылкова дата Дзядоў вызначаецца, калі ўлічыць, што прыпадаюць яны на трэцюю суботу ад Пакроваў. Сярод іншых лістападаўскіх свят і прысвяткаў гэта найбольш значная і адметная падзея ў сялянскім жыцці. Звычайна ў гэты дзень ужо дзесьці да абеду спраўляліся з працай і пачыналі рыхтавацца да ўрачыстай вячэры – Дзядоў. Даводзіліся да ладу двор, хата, абавязкова палілася лазня. Гатаваліся адпаведныя стравы для вячэры, колькасць іх звычайна была няцотнай, праўда, апошнім часам за гэтым практычна не сочаць. Абавязковай у пераліку страў была сыта, якая гатавалася з салодкай, звычайна на мёдзе, вады і пакрышаных кавалачкаў хлеба. Справіўшыся з усімі турботамі, запальвалі свечку, маліліся і садзіліся за стол. Звярталіся да душ памерлых блізкіх, якія запрашаліся на вячэру. Прысутнічала на вячэры і гарэлка. Калі налівалі першую чарку, то пралівалі колькі кропель (дзядам, маўляў). Ад кожнай стравы першая лыжка адкладвалася з гэтай жа мэтай. Закончыўшы вячэру, развітваліся з душамі. Стол

пасля вячэры, як правіла, не прыбіраўся, лічылася, што дзяды ноччу яшчэ падсілкуюцца. Гэта традыцыя бытуе на Кармяншчыне да цяперашняга часу.

## 2.2 “Зіма як казка сваё возьме”

**Піліпаўскі,** ці перадкалядны, **пост,** які доўжыўся шэсць тыдняў, пачынаецца 28 лістапада. У снежні працягваецца **Піліпаўскі пост,** што накладвала свой адбітак на нешматлікія снежаньскія святы і прысвяткі. У гэтым месяцы самая **пара** была **для вячорак** (дадатак№2, малюнак 1). Моладзь збіралася ў адной хаце (калі вёска невялікая) і займалася сваімі адвечнымі справамі. Дзяўчаты ў асноўным пралі кудзелю, стараліся, хлопцы таксама мелі занятак, а то і проста бавілі з дзяўчатамі час. Весялосць, смех, жарты і іншыя атрыбуты жыцця моладзі прысутнічалі нязменна, але ў пашане на вячорках была ўсё ж праца.

9 снежня адзначаецца **Юр'я** зімовы (ці восеньскі). У сялянскім жыцці ў гэты дзень раней падстрыгалі грывы і хвасты коням, аднімалі жарабят і ставілі іх у стойлы. Як і вясновы Юр'я, гэты таксама лічыўся апекуном жывёлы. Толькі, у адрозненне ад вясновага, восеньскі даваў дазвол драпежнікам нападаць на свойскую жывёлу.

У народзе канчатковае ўсталяванне зімы звязвалася з **Міколам** зімовым (19 снежня). З гэтай нагоды сцвяржалася, што "да Міколы няма зімы ніколі", але ў той жа час маглі з сумненнем гаварыць: "Ніводнаму Міколе не вер ніколі".

Звычайна новы цыкл народных свят і абрадаў пачынаецца з **Каляд**. Яны ахоплівалі час з 6 па 18 студзеня. На багатую Каляду вечарам пачыналі хадзіць калядоўшчыкі (дадатак №2 малюнак 2 ). У кожнай мясцовасці былі свае звычаі, але калядавалі часцей за ўсё асобы мужчынскага полу. Хаця нярэдка ў калядным гурце былі разам і мужчыны, і жанчыны, і дзеці. У час калядавання "вадзілі казу"(дадатак №2 малюнак 3). Бралі кажух, вываpочвалі яго поўсцю наверх, і пры дапамозе дугі ладзілася "каза", якая мела галаву, хвост. Выконваў ролю "казы" жвавы і дасціпны невысокага росту хлопец. Суправаджаў "казу" другі хлопец, які выконваў ролю "дзеда" і адпаведна гэтаму быў апрануты. У гурце калядоўшчыкаў былі яшчэ механоша, музыка і іншыя героі.

Падрыхтаваны такім чынам гурт няспешна рухаўся па вёсцы. Заходзячы ў двор, віталі гаспадароў, зычылі дабра і прасілі дазволу калядаваць. З атрыманнем дазволу ўсе станавіліся дзеючымі героямі ці сведкамі цікавых сцэнак. "Дзед" гаварыў: "Гоп, каза, на печку", — і хлопец, які выконваў ролю "казы", умомант аказваўся на печцы. Звяртаўся "дзед" і да гаспадароў: "Дайце каўбасы, каб каза патанцавала", "Дайце сала, каб каза ўстала".

У розных мясцінах калядаванне мела свае асаблівасці. Спецыфічнай асаблівасцю калядавання на Кармяншчыне з'яўляецца пераапрананне ўдзельнікаў у "цыган". Па ўспамінах Н.Аляксеенка з в.Хізаў Кармянскага раёна: "сабяром трапак, здзелаем ляльку, з лялькай хадзілі па дамам, дзіцёнка носім, калі ў цыганку пераапранаемся". Адна ідзе з лялькай, абкрытая, а етыя бегаюць, пяюць, скачуць, карты з сабой носяць: "Давай пагадаю! Маладая, красівая, замуж пойдзеш!". Каляды з'яўляліся падрыхтоўчым этапам для атрымання добрага ўраджаю. Напрыклад, абрад засявання ў вёсках Кармянскага раёна адбываўся на другі дзень пасля шчадравання: "Калі шчадроўшчыкі засеюць збожжам у хаце, то ў гэтым годзе ў хазяіна будзе багаты ўраджай" (в. Багданавічы). У шчадроўна-калядных песнях, адрасаваных гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну, гучаць матывы зычання дабра, здароўя, шлюбнага шчасця. Захоўваецца яшчэ і сёння ў памяці жыхароў Кармяншчыны звычай заклікання марозу на куццю: "Ставілі куццю на стол, і бацька гукаў: "Мароз, мароз, хадзі куццю есці. А еслі не пойдзеш, жалезнай пугай паб'ём" (в. Задуб'е). На Каляды стараліся не рабіць тую работу, якая выконвалася ў любы іншы час. Нельга было прасці, віць вяроўкі, ніткі, намотваць іх у клубок, круціць дзіркі, скручваць што-небудзь, звязваць, гнуць, плесці лапці або што-небудзь іншае, шыць, малаціць, калоць. Відаць, нездарма ў народзе гавораць: "Калядкі — пад'еў ды на палаткі".

15 лютага – **Стрэчанне,** ці **Грамніцы.** "Калі на Грамніцы певень вадзіцы нап'ецца, то на Юр'я вол травіцы наесца". Калі ў гэты дзень снег зранку, то будзе добры ўраджай ранніх збожжавых, калі з абеду, то сярэдніх, увечары — позніх. На свята запальваюць вялікія васковыя свечкі, якія называюцца

грамнічнымі, або грамніцамі. Іх стараецца мецць амаль кожная сям'я. На Грамніцы свечкі асвячаюць ў царкве (дадатак №2, малюнак 4). Пасля асвячэння яны набывалі, як верылі і цяпер вераць ў народзе, цудадзейныя ўласцівасці, з чым звязана шмат уяўленняў. Свечкі давалі ў рукі паміраючым, насілі на поле ў час сяўбы, жніва: "адганялі" з іх дапамогай ведзьму ад каровы, калі яна раптам пераставала даваць ранейшую колькасць малака, шукалі купальскія скарбы. Грамнічныя свечкі выкарыстоўвалі пры вясельных змовінах, адпраўленні каго-небудзь з сям'і ў далёкі шлях, першым выгане жывёлы на пашу і першай яе сустрэчы з пашы, у час навальніцы. Але галоўным іх прызначэннем з'яўляецца ахова дома, у якім яны знаходзяцца.

Пераходным паміж зімовымі і вясновымі святамі з'яўляецца **Масленіца.** Мяркуюць, што масленічныя святкаванні некалі адносіліся да вясновай абраднасці, але потым Вялікім постам яны былі адсунуты да зімовых святаў. На Масленіцу (Масленку) праводзілі зіму і сустракалі вясну. Пасля Масленіцы пачынаўся **Вялікі пост,** таму на гэтае свята гатавалі шмат рознай ежы: бліны, каўбасы, сала, верашчака, квашанка, малочныя стравы, малако, масла і інш. Галоўным героем перадвеснавога свята была моладзь шлюбнага ўзросту, і нежанатая, і тыя, хто толькі пабраўся (дадатак №2, малюнак 5).

Папулярным на Масленіцу сярод моладзі было наладжванне гушканняў. Імкнуліся ўзляцець як мага вышэй, меркавалася, што і лён тады будзе доўгім ды валакністым. Гушканні дзе-нідзе суправаджаліся частаваннем. Не менш любімым заняткам моладзі, не кажучы пра дзяцей, было коўзанне на санках ці чым-небудзь іншым з гары. У нашай мясцовасці існуе традыцыя на Масленіцу спальваць чучала (дадатак №2 , малюнак 4), якое сімвалізуе зіму. У некаторых мясцовасцях існаваў звычай "прывязвання "калодкі". "Калодка" ўяўляла сабой звычайную шчэпку ці пруток, якія "прывязвалі" тым, хто не паспеў узяць шлюб. Тыя, да каго была прывязана "калодка", павінны былі адкупіцца частаваннем. Хадзілі яшчэ на Масленіцу ў адведзіны да родзічаў. Заканчвалася Масленіца ў нядзелю. Ладзілася вячэра, якая цалкам складалася з малочных страў (сыр,

масла, тварог, малако). Развітанне са святам клала пачатак новым, ужо вясновым, турботам.

**2.3 "Вясна - красна, што ты нам прынясла?"**

**Гуканне вясны** (дадатак №3, малюнак 1) на Масленку, а часам і ад Стрэчання, дасягала сваёй кульмінацыі **на Благавешчанне** – 7 красавіка, калі і адбывалася непасрэднае рэтуальнае дзеянне, і прадаўжалася да таго моманту, як узаруць поле, а па другіх сведчаннях, да Вербніцы – перадвелікоднага тыдня. З успамінаў жыхароў Кармянскага раёна: "Калі гукалі вясну, вадзілі карагод, пасярэдзіне была дзяўчына і хлопец, вакол іх жанчыны спявалі песні. Палілі вогнішча, былі ў царкве, потым як мага хутчэй беглі да рэчкі, каб першымі запець. Старушкі выходзілі на мост і спявалі вяснянкі: "Благаславіця, старыя дзяды, Старыя дзяды, ой, вясну-красну пагукаці. Пагукаці, цёплае лета ўстрачаці." Выходзілі на вуліцу, пелі песні і гукалі вясну.

Прысвятак **Саракі** 22 сакавіка адзначае дзень веснавога раўнадзенства. Ужо канчаткова прыходзіць вясна. З успамінаў жыхароў Кармы: "На Саракі мы вось так сустракалі вясну. Пяклі 40 галушачак, птушачак, лісапетак. Пячэнне раздавалі дзецям (дадатак №3 малюнак 2). Ета ўсё дзелалася для таго, штоб адкрываць вясну. Распальвалі вогнішча, гулялі каля рэчкі, гушкаліся на качэлях, пелі песні і гукалі вясну", – успамінае жыхарка вёскі Хізаў, Нерынг Зінаіда Іванаўна . У гэты дзень выганяюць зіму на цэлы год, а іменна: робяць са снегу бабу, потым разбіваюць яе на часткі з патрабаваннем, "каб зіма на дзевяць месяцаў ад нас пайшла", і ў доказ таго, што зіма ўжо як бы прагнана імі, бяруць старыя гаршкі, ідуць да сваіх знаёмых і кідаюць гаршкі на парог, прыгаворваючы: "Гаспадынька, гаспадынька, кідай сваю пражу, зіма ўжо прагнана, адчыняй свае дзверы, заві нас у госці…" Гаспадыня павінна пачаставаць вестуноў вясны, якія прагналі зіму.

**Вялікдзень –** найвялікшае каляндарнае свята, якое складае выключную аметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочнага календара. З велікоднага тыдня пачыналіся веснавыя гульні і карагоды, дні ушанавання продкаў, качанне і біццё яек. Да свята старанна рыхтаваліся. З асабліва

радаснымі і светлымі пачуццямі надзеі і чакання сустракалі вяскоўцы **Вялікдзень** на Кармяншчыне. Святочны настрой, хвалюючы ўнутры стан дарослых перадаваўся ў гэтыя велікодныя дні дзецям, якія “бегалі па яйкі, гулялі ў біткі”. Нейкі цэласны велікодны абрад мы сёння не можам узнавіць, аднак асобныя рытуалы і абрадавыя дзеянні даволі ўстойліва захоўваюцца мясцовай фальклорнай традыцыяй у Кармянскім раёне. Гэта традыцыйнае фарбаванне яек ў чырвоны колер “красілі столькі, колькі хрэснікаў, унукаў”, выпяканне велікоднага хлеба “паскі”, асвячэнне яек і велікоднага хлеба ў царкве, (дадатак №3, малюнак 3) святочная трапеза, гульня ў “біткі”, качанне яек у латках, гушканне на арэлях, магічны абход двароў моладдзю (валачобнікамі), выкананне імі велічальнай песні “Хрыстос уваскрэс”.

**Радаўніца -** свята ўшанавання памерлых, якое адзначаецца ў аўторак на паслявелікодным тыдні, на якое, лічылася, “да абеда аруць, у абед плачуць, а пасля абеду скачуць”(дадатак №3, малюнак 4). Звычайна на Радаўніцу перад абедам усе кроўныя, святочна апранутыя, з фарбаванымі яйкамі і асвечанымі стравамі ішлі на могілкі. Старэйшыя дзеці моўчкі рассаджваліся вакол белага абруса, які слалі на папярэдне старанна дагледжаную магілку апошняга нябожчыка ў родзе. На абрус клалі куццю, яйкі, мяса, хрэн, рыбу, пітво, бліны. Усе стравы абавязкова адкладваліся ці адліваліся для нябожчыка і астаўляліся на магіле. Свята прадаўжалася доўга, а пачыналася гаспадаром, які звяртаўся з наступнай прамовай-рацэяй: “Святыя дзяды, што ад нас паляцелі, хадзіце да нас. Будзем есці, што Бог паслаў!” Далей ішло ўшанаванне памерлага: успаміналі яго лепшыя якасці, рабілі дзеянні, якія маглі зрабіць нябожчыку прыемнае. На могілках качалі велікодныя яйкі - сімвал вечнага жыцця ў прыродзе і яго штогадовага адраджэння, адно з якіх абавязкова пакідалі на магіле. Як частка агульнакаляндарнай традыцыі ўшанавання дзядоў, Радаўніца і цяпер з'яўляецца народным святам, якое адзначаюць у Беларусі (у тым ліку і Кармянскім раёне).

**Юр'я** праходзіць 23 красавіка, свята Юр'я выпадае на 17 тыдзень ад Каляд. На Юр'я сяляне строга захоўваюць пост для жывёлы, людзі моляцца і

абыходзяць сваю ўсадьбу з пірагом, на мяжу тыкаюць костачкі, зберажоныя ад Вялікадня, і гаварылі: “Юрай, уставай рана, адмыкай зямлю, выпускай расу на цёплае лета, на буйное жыта, на ядрыністае, на каласістае, гаспадару на здароўе… На Юр'я коні даўжны вывадзіць на ноч у поля, патамушто ета раса очэнь палезна для коней. Хазяін должэн памаліцца перад іконай св. Юрыя. Патом бярэ сколькі коні, сколькі яек, абходжае хлеў 3 разы, перахрысціўшыся, адчыняе дзверы, пры ўваходзі гаворыць: “Прыйшла Юр'ева раса, не дам вам аўса!”. Выганяюць скаціну ў поле ў панядзелак і пятніцу-лічылі шчаслівымі днямі. Выгадаюць кароў у поле вярбой” (дадатак №3 , малюнак 5) .

### 2.4 “А лецейка-лета, добрая пара…”

Свята найвышэйшага росквіту прыроды, якое вядома пад назвай **Сёмухі, Тройцы, Куста, Русалкі,** святкуецца на сёмым і восьмым тыдні пасля Вялікадня (у народзе яго называюць “Зялёнымі святкамі”). Гэта сапраўдны гімн маці-прыродзе, калі яна ў самай моцнай зялёнай магічнай сіле сваімі гаючымі лекамі ўздымае чалавека да радаснага, аптымістычннага светаўспрымання. У нашай свядомасці ўяўленне аб Зялёных святках перш за ўсё звязана з хрысціянскай Тройцай (трыядай Бог-бацька, Бог-сын, Бог-Дух Святы). На Тройцу ўпрыгожваюць дамы, двары, вуліцы зелянінай, бярозкамі, завіваюць бярозы і вянкі, кумяцца, ідуць з упрыгожанай бярозкай і топяць яе, пускаюць вянкі на ваду, частуюць дзяўчат. Да сённяшніх дзён на Кармяншчыне захаваліся некаторыя моманты, звязаныя са святкаваннем Тройцы (дадатак №4, малюнак 1). Жыхары Кармянскага раёна ўспамінаюць:“Прыносілі ў хату клён, рабіну (“май”), адносілі на сенавал, прыгаворваючы: “Лажу гэты “май”, каб сена было на рай. Вешаюць зялёныя веткі, каб дзеці не балелі, каб у хаце было хораша. На Пятро гэтыя веткі збіраюць, звязваюць і нясуць на вышкі, у хату, ці ў хлеў. На Троіцу сабіралася маладзёж песні спявае, дзяўчаты куміліся, вянкі вілі на галаву. Ад Троіцы “май” да Івана Купалы стаіць. Яго пасля знімалі і палілі на вогнішчы, на Купалле. Гавораць, як граза, ды ў вокнах “май” стаіць, тады Пярун не ўдарыць у хату. У суботу хадзяць на могілкі, памінаюць памерлых (траецкія дзяды)”. Рытуал “завівання вянкоў” як водгук старажытных

жаночых калектыўных абрадаў у свяшчэнных гаях, калі татэмам жанчыны была бяроза, ператварыўся ў наш час у прыгожую гульню, забаву, карагод.

На змену чэрвеню непрыкметна прыходзіць ліпень – макаўка лета ("Ліпень косіць і жне – доўга спаць не дае"). З надыходам **Купалля** ўсе працоўныя турботы адыходзілі на другі план. Свята прыпадае на дзень летняга сонцастаяння і адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня. Святкавалі, як правіла, там, дзе любілі збірацца вяскоўцы, найболыш моладзь (на гары, на беразе ракі). Свята было значным для моладзі: незамужнім дзяўчатам ды нежанатым хлопцам, якія рыхтаваліся да шлюбу і якім пара была ствараць сям'ю, надаралася магчымасць зрабіць выбар.

Загадзя клапаціліся і пра купальскае вогнішча, абавязковы атрыбут свята. Нашы продкі верылі ў магічную, ачышчальную сілу і моц агню, асабліва купальскага. Лічылася, што купальскае вогнішча аздараўляе, ачышчае ад хвароб, нядобрых памкненняў. Таму пачыналіся скокі цераз вогнішча (дадатак №4, малюнак 2). Скакалі па-рознаму: і адзін за адным, і парамі, узяўшыся за рукі. Скокі гэтыя пачыналіся тады, калі вогненна-малінавыя языкі полымя шугалі высока, калі скакаць трэба было як мага вышэй, каб не апячыся. Потым пачыналіся карагоды (дадатак №4, малюнак 2). Рабілі яшчэ на Купалле ляльку, прыбіралі яе, вадзілі ў карагодзе, а потым запальвалі і тапілі, ці пускалі на ваду. На Купалле качаліся па зямлі і з гары, імкнучыся пры гэтым абавязкова закаціцца ў ваду. Тлумачылася гэта верай у тое, што калі качацца ў пэўныя часы па зямлі, то зямля перадасць сваю сілу і моц, падаруе шчасце. Пачыналася Купалле, калі браліся прыцемкі, у разгары свята было ноччу. І менавіта з купальскай ночкай звязана шмат уяўленняў і вераванняў. Найбольш адметнай сярод іх з'яўляецца вера народа, што толькі ў цёмную купальскую ночку, адзін раз у год, зацвітае самая цудоўная кветка – папараць. Калі камусьці пашанцуе сарваць яе, то тады гэты адважны юнак (шукалі кветку найчасцей юнакі) усіх адужае, здолее адамкнуць усе замкі ды запоры, здабудзе ўсё пажаданае. Яшчэ ж будзе ён усяведам: разумець мову птушак, звяроў, раслін, дрэў... Толькі ж не давалася гэтая кветка абы-каму ў рукі. Існавала павер'е, што ў купальскую ноч

здараюцца цуды і можна адшукаць скарбы. На іх месцы то воўк выскачыць у срабрыстым ззянні, то сабака, а то і папараць-кветка зацвіце. Дзяўчаты на Купалле вілі адзін прыгажэй за другі вянкі, варажылі. На світанні збіралі зёлкі, краскі, травы. Да сённяшняга часу ў народзе вераць, што сабраныя ў гэтую ноч зёлкі ды краскі – лекавыя і гаючыя, карысныя чалавеку і жывёле. Заканчвалася свята на ўзыходзе сонца, усе стараліся сустрэць світанак, убачыць, як "сонца грае". На ўзыходзе сонца стараліся выкупацца ў рацэ ці абмыцца купальскаю расою, верылі, што гэта дапаможа пазбегнуць хвароб, прыбавіць здароўя. Новы дзень клаў пачатак новаму святу пад назвай Іван. А тыя, хто хацелі даведацца пра свой лёс, на Купалле варажылі (дадатак №4, малюнак 2).

Своеасаблівым працягам Купалля было **свята апосталаў Пятра і Паўла**. У гэты дзень кумяцца. З Пятра лета хіліцца на восень ("Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйшоў Ілля – апала два").

Паводле народнага календара, восень пачынаецца з **Іллі,** які адзначаецца 2 жніўня. Пра ранні надыход восені сведчаць ранняе пажаўценне лісця, грыбы (апенькі з'явіліся – то лета закончылася). У асноўным да жніўня прымяркоўваюцца так званыя рабінавыя, ці вераб'іныя ночы. Лічыцца, што Ілля павінен прынесці дажджы з навальніцамі ("Ілля наробіць гнілля"). "Ілля блізка, гніся, баба, нізка, уставай раненька ды жні дапазненька".

Асноўнай працай земляроба ў жніўні з'яўляецца **жніво** (дадатак №4, малюнак 3). Напярэдадні жніва адбываўся абрад пакрывання поля. На золку ў поле выходзіла маладзіца, і ў прысутнасці некалькіх дзяўчат нажынала невялікі снапок жыта. Абхінуўшы яго світкаю, ручніком або кавалкам новага палатна, падкідала ўгору, прыгаворваючы: “Пакрыла ніўку, На добрую спажыўку. Парадзі, Божа, наша збожжа!” Дзяўчаты, лёгка кружачыся, ёй падпявалі: “Крыта, крыта! Поўна жыта!..”

Апошнія словы спявалі, прыйшоўшы ў хату. Маладзіца аддавала снапок гаспадыні, а тая дарыла ёй палатно і грошы. Гаспадар, да якога маладзіца падыходзіла з паклонам, частаваў яе і запрашаў на дажынкі.

Зажынкі часцей пачыналі ў суботу пад вечар. Перад тым як выправіцца на зажынкі, прыбіралі чыста хату, апраналіся калі не ў святочныя ўборы, то ў чыстую вопратку. На зажынкі звычайна ішла гаспадыня адна або з дочкамі ці нявесткамі ці яе дачка, узяўшы спецыяльна прыгатаваныя для гэтай падзеі харчы. Павітаўшыся папярэдне з нівай, пачыналі жаць. Жніво пры гэтым абмяжоўвалася адным снапом або нязначнай іх колькасцю. Дадому вярталіся пад песні, з першым нажатым снапом, які ставіўся ў хаце на покуці пад абразамі.

Як і да ўсякай іншай цяжкай працы, да жніва таксама прымяркоўваліся пэўныя магічныя дзеянні. Так, калі пачыналася жніво, то жняя зразала адну жменю, рабіла вязьмо і падпяразвалася ім, прымаўляючы пры гэтым: “Госпадзі Божа, памажы, Злому дыхаць залажы”. Як можна меркаваць, такім чынам жняя перасцерагалася ад сурокаў. Падпяразвалася ж яна першым вязьмом, каб не балела ў час жніва спіна. У нашай мясцовасці таксама існавалі звычаі зажынак і дажынак. З успамінаў жыхароў Кармянскага раёна: “Выбіралі маладых жанчын, якія апраналіся ў чыстае адзенне. Яны зажыналі некалькі снапоў, а потым за імі ўсе астатнія жалі. Пад першы сноп клалі хлеб і соль, хлеб разлажвалі, каб пад час жніва спіны не балелі. Першыя снапы бралі дамоў, ставілі ў кут. Яго перавязвалі лентай. У куце гэты сноп стаяў да Прачыстай, тады яго аббівалі, хадзілі ў цэркву і пасвяцалі зярно, а на наступны год сеялі першым. Пад час жніва спявалі песні. Як дажыналі жыта, сабіралі некалькі каласкоў, звязвалі іх ў вузел, пад іх клалі хлеб і соль. Гэта лічылася дажынка (барада). Каб барада была чыстая, яе палолі, палівалі вадой, пелі дажынкавую песню, ішлі да гаспадара жыта і вешалі яму на шыю вянок з каласкоў, а ён частаваў жнеек гарэлкай. Лічылася, што “хто бараду сарве, таму Бог шчасце прынясе”. Таму па начах, каб ніхто не бачыў, маладыя хадзілі і зрывалі бараду. На дажынках спявалі вельмі жаласлівыя песні. У вёсках Кармянскага раёна да сённяшніх дзён засталіся некаторыя моманты гэтага звычаю (дадатак №4, малюнак 4).

У апошні месяц лета святкуюцца **тры Спасы** – 14 жніўня (“мядовы”), 19 жніўня ("яблычны") (дадатак №4, малюнак 5) і 29 жніўня ("хлебны"). Найбольш

вядомы быў яблычны Спас (19 жніўня). 3 гэтага дня дазвалялася есці яблыкі. Першы ўраджай садавіны і агародніны звычайна асвячалі. Звычай асвячаць яблыкі і агародніну ў царкве захоўваецца ў нашай мясцовасці і цяпер. У мінулым да Спаса былі прымеркаваны кірмашы. Гандлявалі садавіной, агароднінай, прадавалі грыбы, жыўнасць, птушку, рамесныя вырабы, посуд і інш.

## Заключэнне

У сваім даследаванні мы прыйшлі да высновы: Кармяншчына славіцца сваёй багацейшай старажытнай народнай культурай. Ведаць сваю нацыянальную народную творчасць, родную мову, гісторыю і культуру – гэта значыць не парываць з вытокамі сваёй Айчыны, свайго народа. Далёкія галасы мінулых эпох у нашых сэрцах дапамагаюць выхаваць у маладога пакалення такія маральныя якасці, як спачуванне да людзей, здольнасць радавацца чужым поспехам, сумаваць ад чужога гора, сцвярджаюць высокія маральныя каштоўнасці – працавітасць, смеласць, дабрыню, спагадлівасць і міласэрнасць. Старажытная народная культура з'яўляецца яскравым доказам таго, што мы, беларусы, мелі багатае мінулае ўжо на першым этапе нацыянальна- культурнага развіцця народа.

На пачатку дваццатага стагоддзя Максім Гарэцкі пісаў: “Народная творчасць наогул, а беларуская народная творчасць увасобку – гэта мора, якое хавае ў сабе незлічоныя скарбы. Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць”. Сучасная моладзь таксама павінна разгадаць гэтыя скарбы і ведаць традыцыі і звычаі свайго народа. Народная спадчына дапамагае нам разабрацца ў складаных жыццёвых пытаннях, дзякуючы ёй, мы адчуваем непаўторны каларыт духоўнага жыцця нашых продкаў. Яна прымушае нас думаць і марыць, спрыяе выпрацоўцы актыўнай творчай пазіцыі.

Такім чынам, народ, які не ведае і не хоча ведаць свайго мінулага, ніколі не будзе мець будучага. Адным словам, “каб не страціць святое штосьці”, трэба ведаць сваю гісторыю, свае карані, захаваць памяць і зберагчы для нашчадкаў усё тое, што зараз належыць нам

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Беларускія народныя абрады.//Мн.: Беларусь, 1994. – 128 с.
2. Беларуская мова і літаратура: серыя "У дапамогу педагогу" /Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2004. – №4. – с. 49-52.
3. Беларуская мова і літаратура: серыя "У дапамогу педагогу" /Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – №5. – с. 59-63.
4. Крыніц кармянскіх пераззвоны (абрады і песні ў сучасных запісах).// Гомельскі цэнтр навукова- тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 2000. – 210с.
5. Ліцвінка В. "Святы і абрады беларусаў". –Мн. "Беларусь", 2001. – 191 с.

**Дадатак № 10**

Анкета

1. Якія восеньскія святы (з народнага календара) вы ведаеце? (Другая Прачыстая, Уздзвіжанне, звычай “Талака”і хадзіць “у піва”, Пакроў, Дзяды).
2. Традыцыі і звычаі якіх восеньскіх свят захоўваюцца ў вашай сям'і(у вашай мясцовасці)? (Другая Прачыстая, Уздзвіжанне, звычай “Талака”і хадзіць “у піва”, Пакроў, Дзяды).
3. Якія зімовыя святы(з народнага календара) вы ведаеце? (звычай “Вячоркі, Мікола, Каляды, Стрэчанне, або Грамніцы, Масленіца).
4. Традыцыі і звычаі якіх зімовых свят захоўваюцца ў вашай сям'і(у вашай мясцовасці)? (звычай “Вячоркі, Мікола, Каляды, Стрэчанне, або Грамніцы, Масленіца).
5. Якія веснавыя святы (з народнага календара) вы ведаеце? (Благавешчанне, Гуканне вясны, Саракі, Вялікдзень, Радаўніца, Юр'еў дзень).
6. Традыцыі і звычаі якіх веснавых свят захоўваюцца ў вашай сям'і(у вашай мясцовасці)? (Благавешчанне, Гуканне вясны, Саракі, Вялікдзень, Радаўніца, Юр'еў дзень).
7. Якія летнія святы (з народнага календара) вы ведаеце? (Тройца, Купалле, свята апосталаў Пятра і Паўла, тры Спасы – 14 жніўня-мядовы; 19 жніўня-яблычны; 29 жніўня-хлебны, Зажынкі і дажынкі)
8. Традыцыі і звычаі якіх летніх свят захоўваюцца ў вашай сям'і(у вашай мясцовасці)? (Тройца, Купалле, свята апосталаў Пятра і Паўла, тры Спасы – 14 жніўня-мядовы; 19 жніўня-яблычны; 29 жніўня-хлебны, Зажынкі і дажынкі).
9. Ці патрэбна захоўваць традыцыі і звычаі каляндарных свят, якія існуюць у вашай сям'і( мясцовасці)? Так. Не.
10. Ці будзеце вы прадаўжальнікамі традыцый і звычаяў сваёй сям'і (мясцовасці) у будучым? Так. Не.

**Дадатак №10**

**Табліца 1**

| № | **Восеньскі цыкл** | **%** | **Зімовы цыкл** | **%** | **Веснавы цыкл** | **%** | **Летні цыкл** | **%** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Другая Прачыстая | 47 | Вячоркі | 12 | Благавешчанне | 53 | Тройца | 94 |
| 2. | Уздзвіжанне | 63 | Мікола | 35 | Гуканне вясны | 35 | Купалле | 100 |
| 3. | Талака | 14 | Каляды | 100 | Саракі | 59 | Свята апосталаў Пятра і Паўла | 12 |
| 4. | Хадзіць “у піва” | 6 | Стрэчанне | 18 | Вялікдзень | 71 | Спасы(мядовы, яблычны, хлебны) | 59 |
| 5. | Пакроў | 100 | Масленіца | 100 | Радаўніца | 100 | Зажынкі і дажынкі | 100 |
| 6. | Дзяды | 84 | ----------------- | | Ю' реў дзень | 14 | -------------- | |

**Табліца 2**

| № | **Восеньскі цыкл** | **%** | **Зімовы цыкл** | **%** | **Веснавы цыкл** | **%** | **Летні цыкл** | **%** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Другая Прачыстая | 38 | Вячоркі | 0 | Благавешчанне | 47 | Тройца | 76 |
| 2. | Уздзвіжанне | 34 | Мікола | 39 | Гуканне вясны | 29 | Купалле | 94 |
| 3. | Талака | 6 | Каляды | 89 | Саракі | 53 | Свята апосталаў Пятра і Паўла | 6 |
| 4. | Хадзіць “у піва” | 0 | Стрэчанне | 12 | Вялікдзень | 87 | Спасы(мядовы, яблычны, хлебны) | 73 |
| 5. | Пакроў | 82 | Масленіца | 89 | Радаўніца | 94 | Зажынкі і дажынкі | 48 |
| 6. | Дзяды | 68 | ----------------- | | Юр’еў дзень | 0 | -------------- | |